Т.М.Логвін, Мінск

«З прыродай зліушыся душой…»
(аб лірычных пейзажах М.Багдановіча і М. Рубцова)

Адметнае месца у сусветным літаратурным працэсе займае мастацкая спадчына Максіма Багдановіча і Мікалая Рубцова - паэтау, якім было наканавана лёсам пайсці з жыцця заучасна, на самым пачатку творчай дарогі. «Калі паміраюць паэты, - пісау А.Грачанікау, -

Яны забіраюць з сабою
Талент свой адмысловы,
Кінуушы у мора людское
Свае несмяротныя словы».

За нядоугі жыццёвы шлях у двадцаць вёсен і зім беларускі класік стварыу свой непауторны «Вянок», цудоуную паэтычную кніжку, якою вельмі даражыу да апошняй хвіліны:

У краіне светлай, дзе я уміраю,
У белым доме ля сіняй бухты,
Я не самотны, я кнігу маю
З друкарні пана Марціна Кухты [1, с. 268].

«Творы сапраўднай паэзіі маюць адну адметную якасць: яны вельмі лёгка, падчас з першага разу, затрымліваюцца і надоўга застаюцца у памяці, - падкрэслівае Ніл Гілевіч. – Тлумачыцца гэта не толькі іх праудзівым і глыбокім зместам, вялікім чалавечым пачуццём, непауторнымі паэтычнымі вобразамі, але і дакладнасцю радка, лагічнасцю і паслядоунасцю думкі, натуральнасцю гучання, сакавітасцю мовы. Большасць жа вершау Багдановіча як раз і вызначаецца гэтым» [2, с. 252].

Прырода узнагародзіла паэта рэдкай прывабнасцю, дасціпнасцю, чулай душой, маральнай сілай і духоунай прыгажосцю. Характво яго асобы цесна звязана са здольнасцю чуйна адклікацца на чужы боль, свята верыць у лепшую будучыню шматпакутнай радзімы, пільна прыглядацца да навакольнага свету з усімі яго фарбамі і адценнямі, шанаваць народную беларускую мову і любіць дарагія сэрцу краявіды.

Змешчаныя у зборніку вершы аб роднай прыродзе «складаюць вельмі своеасаблівую старонку у беларускай пейзажнай лірыцы, старонку, якую у сілу абставін мог напісаць толькі Багдановіч і якую нельга паутарыць» [2, с. 243].

Свет прыроды у яго паэзіі здіуляе сваёй бясконцай разнастайнасцю абрысау, колерау, гукау. У вершы «Цёплы вечар, ціхі вечар, свежы стог…» паэт паказвае, што валодае дарам бачыць нябачнае, чуць нячутнае, умее зауважаць узаемную спалучанасць усяго існага, адчуваць духоуную еднасць з прыродай:

Бачу я, з прыродай зліушыся душой,
Як дрыжаць ад ветру зоркі нада мной,
Чую у цішы, як расце трава [1, с. 36].

Падобныя шчырыя пачуцці, разуменне непарыунай злітнасці з прыродай, трапна, праніклiва, ва усёй сукупнасці перажытага і адчутага передае у вершы «Тихая моя родина» таленавіты рускі М. Рубцоу:

С каждой избою и тучею,
С громом, готовым пасть,
Чувствую самую жгучую,
Самую смертную связь [3, с. 133].

« Совершенная и простая форма его стихов созвучна русской душе», - сказал про М. Рубцова яго сучаснік [3, с. 9]. На жаль, радкі яго верша аказаліся прароцкімі:

Да, недолго глядел он на Русь
Голубыми глазами поэта [3, с. 92].

Гэты «редчайший русский талант, чуткий ко всему истинному» пражыу на дзесяць гадоу даужэй за Багдановіча. У яго паэтычнай спадчыне чатыры зборнікі: «Лирика» (1966), «Звезда полей» (1967), «Душа хранит» (1969), «Сосен шум» (1970).

«Поэтическое зодчество Рубцова, вызванное к жизни высотой духовных устремлений времени, которые уже не могли удовлетвориться «гениальными конструкциями стиха», подтверждало необходимость новых вершин.Поэзия Рубцова была живым ручательством необходимости и возможности их достижения. Имя Рубцова стало, по существу, синонимом того поэтического явления, которое подготовило в сознании читателей переоценку ценностей, напомнив о бессмертии традиций отечественной поэзии», - сведчыць Ю. Селезнеу [3, с. 259].

Што безумоуна зблізкае Максіма Багдановіча і Мікалая Рубцова – паэтау розных пакаленняу і нацыянальных культур – так гэта любоу да «Маці-Краіны» і «ціхай радзімы», якую абодва паэта выказваюць праз шэдэуры пейзажнай лірыкі. «Багдановіч лічыуся б выдатным паэтам і тады, калі б ён нам пакінуу толькі вершы аб роднай прыродзе», - слушна зауважыу Н. Гілевіч [2, с. 246].

Карціны прыроды у вершах паэта, улюбёнага у родны край, хвалююць арганічным спалучэннем тонкага лірызму і цвярозага рэалізму, рамантычнай узнёсласцю і псіхалагічнай дакладнасцю.

Сумным, элегічным настроем прасякнуты вершы «Вечар на захадзе у попеле тушыць…», «Ноч». Зачароувае сваёй маляунічасцю апісанне цёплага і ціхага летняга вечара у першым вершы:

Вечар на захадзе у попеле тушыць
Кучу чырвоных кавалкау вугля;
Ціха усё; вецер лістка не зварушыць,
Не скалыхнуцца ні траукай паля [1, с. 39].

Такая вячэрняя ціша, сузіранне у небе «зялёным, як лёд», іскрыстых зорак і бледна-сіняга маладзіка ацаляюць душу лірычнага героя, напауняюць «хоць бы на момант» растрывожанае сэрца спакоем. «У вершы дасягнуты той узровень мастацкасці, калі, як кажуць, і мастацтва не зауважаеш» [2, с. 245].

Нешта вельмі істотнае, шчырае, вечнае чуецца не толькі у настроі, але і у сэнсе другога верша Багдановіча – «Ноч»:

Ціха усё было на небе, зямлі і на сэрцы…
Ноч цемнатою навокал усё пакрывала,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Ясныя зоркі блішчалі, і месяц ужо выплыу,
Неба, і лес, і палі серабром аблівая [1, с. 150].

Свае пачуцці, абуджаныя прыродай, аутар выказвае у спакойнай, эмацыянальна стрыманай манеры.

Знамянальным у гэтым сэнсе з'яуляецца верш М.Рубцова «Чудный месяц плывёт гад рекою», авеяны пафасам услауленне прыроднай рэчаіснасці:

И откуда берется такое,
Что на ветках мерцает роса,
И над родиной, полной покоя,
Так светлы по ночам небеса! [3, с. 300].

Вершаваны філасофскі роздум увесь прасякнуты глыбокім адчуваннем радзімы, як месца адзінага і непауторнага.

Сугучныя радкі, спаяныя адным настроем, ёсць і у вершы «Ночь на родине»:

Высокий дуб. Глубокая вода.
Спокойные кругом ложатся тени.
И тихо так, как будто никогда
Природа здесь не знала потрясений! [3, с. 231].

Для Рубцова прырода – гэта жыватворная прыгажосць і вечная гармонія.

Адметнымі рысамі паэтычнага почырку М.Рубцова з'яуляецца жыццесцвярджальны пафас, эмацыянальная экспрэсія. «В нём соединились, столь естественно и столь родственно поэтическая искренность, природность таланта с осознанной необходимостью овладения высоким профессионализмом; органическое чувство народности с причастностью к классическим традициям культуры»[3, с. 259-260].

Пры усім адрозненні творчай манеры, пры усёй аутарскай індывідуалізацыі у Багдановіча і Рубцова пераклікаюцца матывы і вобразы. Авеяны жыццесцвярджальнасцю паэтычныя канстатацыі М.Рубцова: «И всё ж прекрасен образ мира…»[3, с. 304], «Воспрянув духом, выбегу на холм и всё увижу в самом лучшем свете» [с. 155], «Всё улеглось! Одно осталось ясно – что мир устроен гозно и прекрасно» [с. 226], «Прекрасно небо голубое!» [ с. 207], «Как весь простор, небесный и земной, дышал в оконце счастьем и покоем» [с. 270], «Светлый покой опустился с небес и посетил мою душу!» [с. 196].

Мастак выразна передае захапленне красой прыроды: «Чтоб удивительно светлое утро встретить, как светлую весть» [с. 195], «Незабываемые виды! Незабываемый покой!» [с. 200], «Давно знакомый мир лучистый- воздушный, солнечный, цветистый» [с. 212].

Матыу першаснасці прыгожага і вечнага у жыцці

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ